# Навіны Вашынгтонскага гуртка БАЗА / News of the Washington Chapter of BAZA

28 лютага адбыўся чарговы сход гуртка Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў горадзе Вашынгтоне, у якім узялі ўдзел 12 сяброў.

Сход пачаўся са справаздачы былой старшыні Алесі Сёмухі аб дзейнасьці гуртка за апошні год. Потым было абранае новае кіраўніцтва ў складзе двух су-старшынь Алесі Кіпель і Яраслава Крывога (з абавязкамі скарбніка), а таксама сакратара Вячаслава Бортніка.

Асаблівая ўвага ўдзельнікаў сходу была нададзена абмеркаваньню традыцыйных сакавіцкіх візытаў у Кангрэс ЗША, прысьвечаных угодкам незалежнасьці БНР (25 сакавіка). Былі вызначаныя практычныя крокі па арганізацыі візітаў, а таксама адказныя за іх выкананьне. Падрыхтоўчую сустрэчу было вырашана правесьці ў Роквіле, штат Мэрыленд, 21 сакавіка.

Сход таксама абмеркаваў дзейнасьць гуртка на далейшаю пэрспэктыву: удзел у Кангрэсе БАЗА ў траўні сёлета, стратэгіі па прыцягненьні новых сябраў, наладжваньне кантактаў з іншымі нацыянальнымі дыяспарамі і мясцовымі недзяржаўнымі арганізацыямі (НДА), разьвіцьцё культурнага напрамку дзейнасьці, выкарыстоўваньне ў працы сучасных інфармацыйных тэхналогіяў.

**News of the Washington Chapter of BAZA**

A regular meeting of the Washington, DC circle of the Belarusian-American Association took place on February 28, 2009, with 12 members participating.

The meeting began with a report by the former President,

Alesya Semukha, about the activities of the circle during the past year. Later, new leadership was selected, consisting of two Co-Presidents, Alice Kipel and Yaraslau Kryvoi (also with the responsibilities of Treasurer), and Viachaslau Bortnik as Secretary.

Particular attention was paid by meeting participants to planning for the traditional March visits to the U.S. Congress, dedicated to the anniversary of the independence of the Belarusian Democratic Republic (March 25). Practical steps for organizing the visits were identified, as well as the persons responsible for their execution. It was decided to hold a preparatory meeting in Rockville, MD, on March 21.

Meeting participants also planned the activities of the circle for the longer term: participation in the BAZA Congress in May of this year, strategies for attracting new members, establishing contacts with other nationalities' diaspora groups and local non-governmental organizations (NGOs), the development of a cultural aspect to the circle's activities, and use of new information technologies in the group's work.